ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2022 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю народнай музыкі
“Зайграйце, музыкі”

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай музыкі “Зайграйце, музыкі!” (далей – Фестываль), які адбудзецца 21(22) мая 2022 г. у г. Ліда.

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: садзейнічанне мастацкаму развіццю і павышэнню выканальніцкага ўзроўню ансамбляў народнай музыкі і аркестраў народных інструментаў; павышэнне і ўзбагачэнне рэпертуару калектываў мастацкай творчасці лепшымі ўзорамі народнай музыкі; папулярызацыя інструментальнай музыкі, развіццё выканальніцкай школы ігры на народных інструментах; узбагачэнне духоўнага свету насельніцтва здабыткамі народнага песеннага і інструментальнага мастацтва; фарміраванне эстэтычнага густу маладога пакалення на лепшых узорах нацыянальнай музычнай культурнай спадчыны і сучаснага мастацтва.

3. Арганізатары Фестывалю: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, аддзел культуры Лідскага райвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ствараецца арганізацыйны каміэт (далей – аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (Дадатак 1).

5. Аргкамітэт:

5.1. уносіць на разгляд упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне Фестывалю, умовах яго правядзення і відах заахвочвання ўдзельнікаў;

5.2. узгадняе склад рэжысёрска-пастановачнай групы, журы, спіс удзельнікаў, праграму правядзення, узоры ўзнагарод, іншую

атрыбутыку, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю;

5.3. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі Фестывалю;

5.4. вырашае іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем.

6. Фестываль праводзіцца 1 раз у тры гады ў г. Ліда.

7. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Фестывалю ці яго адмены па аб'ектыўных прычынах калектывы, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

8. У Фестывалі прымаюць удзел лепшыя дарослыя і дзіцячыя аркестры народных інструментаў, ансамблі народнай музыкі і песні, інструментальныя ансамблі – пераможцы раённых (гарадскіх) фестываляў, аглядаў, конкурсаў.

9. Да ўдзелу ў конкурснай праграме Фестывалю калектывы рыхтуюць 2 інструментальныя творы, адзін з якіх абавязкова беларускага аўтара (для ансамбляў народнай музыкі і песні – 2 народныя інструментальныя творы альбо 1 народная песня і 1 народны інструментальны твор) працягласцю да 6 хвілін.

10. Агульная заяўка (Дадатак 2) на ўдзел у Фестывалі ад раёнаў Гродзенскай вобласці і г. Гродна незалежна ад ведамаснай прыналежнасці калектываў зацвярджаецца начальнікам аддзела (загадчыкам сектара) культуры, альбо начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі рай(гар)выканкама і дасылаецца да 24 красавіка 2022 г. на электронны адрас ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці": omcnt@mail.grodno.by .

11. Афіцыйныя запрашэнні для ўдзелу ў Фестывалі дасылаюцца пасля разгляду аргкамітэтам заявак і папярэдняга (пры неабходнасці) праслухоўвання калектываў альбо прагляду відэаматэрыялаў.

12. Па выніках Фестывалю журы (Дадатак 3) вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступеняў) у наступных намінацыях: дарослы аркестр народных інструментаў; дзіцячы аркестр народных інструментаў; дарослы інструментальны ансамбль (акрамя дуэтаў, трыа); дзіцячы інструментальны ансамбль (акрамя дуэтаў, трыа); дарослы ансамбль музыкі і песні; дзіцячы ансамбль музыкі і песні.

13. Выступленні калектываў ацэньваюцца па наступных крытэрыях: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; мастацкі ўзровень рэпертуару і якасць апрацоўкі (аранжыроўкі); рэжысёрскае і мастацкае афармленне нумару; артыстызм, арыгінальнасць выканання; выкарыстанне рэгіянальнага матэрыялу; касцюміраванне.

14. Журы Фестывалю вызначае пераможцаў у спецыяльных намінацыях: “лепшы дэбют”; “лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумару”; “лепшая аранжыроўка песні”; “лепшая апрацоўка беларускай народнай мелодыі”; “захаванне традыцый беларускай народнай песні”; “лепшая інструментоўка (пералажэнне) твора”; “лепшая інструментальная група ансамбля народнай музыкі і песні”; “за дырыжорскае майстэрства”.

15. Пры адсутнасці ўдзельнікаў у намінацыі журы Фестывалю пакідае за сабой права аб’ядноўваць намінацыі, не прысвойваць месцы, падзяляць II і III месцы, вызначаць дадатковыя спецыяльныя намінацыі ў межах выдзеленага прызавога фонду.

16. Лаўрэаты Фестывалю ўзнагароджваюцца дыпломамі ў рамках і прызамі, пераможцы ў спецыяльных намінацыях - дыпломамі ў рамках і спецыяльнымі прызамі, астатнія калектывы – дыпломамі “за ўдзел у фестывалі”.

17. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

18. Фінансаванне фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: аплата працы члену журы, вядучых і рэжысёра, праезд члена журы (Мінск – Гродна – Мінск), прызы, спецыяльныя прызы, рамкі для дыпломаў, паліграфічная прадукцыя (выраб дыпломаў, афіш, праграмак).

19. Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

20. Усе выдаткі па знаходжанні на Фестывалі калектываў ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючых арганізацый.

21. У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй арганізатарамі Фестывалю дапускаюцца змены ў дадзенай Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення, дапускаюцца змены фармата, у тым ліку дыстанцыйна, а таксама перанос даты правядзення да стабілізацыі сітуацыі (у іншыя тэрміны).

22. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі.

23. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю
народнай музыкі
“Зайграйце, музыкі!”

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Ложачнік С.В. | старшыня Лідскага раённага выканаўчага камітэта, сустаршыня аргкамітэта (са згоды); |
| Леўшунова Н.Ф. | начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Вайцюкевіч Н.М. | галоўны спецыяліст аддзела культуры Лідскага райвыканкама; |
| Грыгаран Т.У. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Мерчы Т.І. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Тур І. Э. | дырэктар ДУ “Палац культуры горада Ліды”. |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю
народнай музыкі
“Зайграйце, музыкі!”

**Форма заяўкі**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
гар(рай)выканкама
2022 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі народнай музыкі
“Зайграйце, музыкі!”

1. Раён(горад)________________________________________
2. Поўная назва калектыву______________________________
3. База дзейнасці калектыву_____________________________
4. Намінацыя__________________________________________
5. Узроставая катэгорыя (дзіцячая, дарослая)________________
6. Назва, аўтары і працягласць кожнага нумару ______________
__________________________________________________________
__________________________________________________________
__________________________________________________________
7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву__________
__________________________________________________________
8. Пашпартные дадзеныя кіраўніка калектыву_________________
__________________________________________________________
9. Тэлефоны (службовы, мабільны) _________________________
10. Колькасць удзельнікаў ______________________________
11. Тэхнічнае забеспячэнне (колькасць мікрафонаў, крэслаў)
12. Творчая характарыстыка (не больш 50 слоў)

Кіраўнік базавай установы ______________________

Заяўкі дасылаюцца да 24 красавіка 2022 г. на адрас: 230023 г.Гродна, вул.Савецкая,8. ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. Кантактныя тэлефоны: 8(0152)623782, 623799; тэл./факс: 8(0152)623787. e-mail: omcnt@mai.grodno.by

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю
народнай музыкі
“Зайграйце, музыкі!”

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю народнай музыкі
“Зайграйце, музыкі!”

| | |
|---|---|
| Бартноўскі В.В. | прафесар УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, галоўны дырыжор Еўразійскага сімфанічнага аркестра, старшыня журы Міжнароднай музычнай прэміі BELBRAND AWARD, Ганаровы акадэмік Міжнароднай Гуманітарнай Акадэміі “Еўропа – Азія”, старшыня журы; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, намеснік старшыні журы; |
| Серакова А.В. | дырэктар УА “Лідскі дзяржаўны музычны каледж”, намеснік старшыні журы; |
| Грыгаран Т.У. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. |